

НАШЫ СЛАЎНЫЯ ЖАНЧЫНЫ!
З НАДЫХОДЗЯЧЫМ СВЯТАМ -- ДНЁМ 8-га САКАВІКА!

*... Бог, сотворив мужчину,*
*Сделал земли половину;*
*Женщину создавая,*
*Создал половину он рая,*
*И, мужчину затмив*
*красотою,*
*Сияет она над землёю...*
КАЛЬДЕРОН
"Жизнь есть сон".

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 3 (923) | ЧАЦВЕР, 27 ЛЮТАГА 1997 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За плённую шматгадовую навукова-педагагічную працу кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчыца кафедры беларускай мовы* ***Аляксандра Аляксандраўна СТАНКЕВІЧ*** *узнагароджана Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.*

## АТРЫМАЛІ СЕРТЫФІКАТЫ ПСІХОЛАГАЎ

Ужо на працягу трох гадоў пры нашым універсітэце вядзецца падрыхтоўка псіхолагаў. Гэтую спецыяльнасць набываюць студэнты педагагічных факультэтаў, настаўнікі, работнікі дашкольных устаноў і медыцыны, праваахоўных органаў, іншых арганізацый. У навучальным працэсе прымае актыўны ўдзел і аказвае значную дапамогу дырэктар дэпартамента псіхалогіі г.Піза (Італія) прафесар Гаэтано Барлета.

У бягучым месяцы закончана тэарэтычная праграма падрыхтоўкі спецыялістаў важнай сучаснай прафесіі. Звыш ста чалавек атрымалі сертыфікаты псіхолагаў. Ва ўрачыстай абстаноўцы іх уручылі курсантам прэзідэнт нацыянальнай арганізацыі сацыяльнай дапамогі насельніцтву (ANPAS) пан Буллеры і адказны сакратар гэтай арганізацыі Серджо Кастэллі.

Пры садзейнічанні прафесара Гаэтано Барлета ў гонар першага выпуска псіхолагаў была наладжана памятная вечарына.

## ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСУ

Рэспубліканскі Цэнтр фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў Міністэрства адукацыі нашай краіны правёў у мінулым годзе конкурс ВНУ Беларусі на лепшую пастаноўку спартыўна-масавай работы, па падрыхтоўцы спартыўных рэзерваў і дасягненню найвышэйшых паказчыкаў у спорце. Пераможцам прызнаны факультэт фізічнай культуры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны, які ўзнагароджаны дыпломам І ступені.

***На здымку:*** **студэнтка факультэта фізічнай культуры сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў па сямібор'ю ў Атланце**

**Наталля Сазановіч.**
**У сёлетнім годзе яна таксама імкнецца дабіцца высокіх вынікаў у сваім відзе спорту і пацвердзіць імя адной з мацнейшых лёгкаатлетак у свеце.**



**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## НОВАЯ СУСТРЭЧА З ФРАНЦУЗСКІМІ ВУЧОНЫМІ

На працягу шасці дзён у нашым універсітэце знаходзіліся дырэктар інстытута "Інжынерыя менеджмента" універсітэта Клермон-Феран-І, садырэктар Франка-беларускага інстытута кіравання прафесар Морыс Шэневуа, яго намесніца Мары-Антуанет Дзюбост, адміністратар названага французскага інстытута Жан-Мішэль Юс. Яны прачыталі для студэнтаў Франка-беларускага інстытута кіравання цыкл лекцый па спецыяльных дысцыплінах. Былі абмеркаваны таксама пытанні па рэалізацыі праграмы ТЭМПУС -- агульнаеўрапейскага супрацоўніцтва. Госці азнаёміліся з эксплуатацыяй камп'ютэраў, пастаўленых у ГДУ ў адпаведнасці з названай праграмай. Ішла размова аб наступным этапе ажыццяўлення праграмы ТЭМПУС.

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат гісторыка-юрыдычнага факультэта, кафедра ўсеагульнай гісторыі горача віншуюць асістэнта названай кафедры* ***МЯЗГУ Мікалая Мікалаевіча*** *з зацвярджэннем яго БелВАКам у вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.*

***

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат матэматычнага факультэта, кафедра алгебры і геаметрыі горача віншуюць начальніка навукова-даследчага сектара* ***САФОНАВА Васіля Рыгоравіча*** *і асістэнта названай кафедры* ***СЕЛЬКІНА Вадзіма Міхайлавіча*** *з зацвярджэннем іх БелВАКам у вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.*

*СУЧАСНІКІ*

# ПАСТАЯННЫ АРЫЕНЦІР



Так ужо ў Ірыны павялося з самага дзяцінства -- калі бярэцца за якую-небудзь справу, абавязкова даб"ецца самых лепшых вынікаў. Вучыцца ў школе -- дык толькі на "выдатна", адначасова музычную адукацыю атрымліваць -- таксама на адны пяцёркі. І калі пасля заканчэння з залатым медалём СШ N16 г.Гомеля стала студэнткай ГДУ, яго гістарычнага аддзялення, гэтай добрай сваёй традыцыі не змяніла. Зноў паспяховая вучоба, у заліковай кніжцы -- круглыя "5" і, як вынік, ганаровае званне імяннога стыпендыяткі. Але пра Ірыну Эсмантовіч не скажаш, што толькі веды яе цікавілі. У студэнцкія гады яна была заўсёды на быстрыні жыцця, на чале акадэмічнай групы, якая ў той час лічылася лепшай не толькі ва універсітэце, але і ў вобласці.

Дыплом аб заканчэнні ГДУ атрымала таксама не звычайны, а чырвоны, з адзнакай. Працы ў роднай школе N16, куды прыйшла выкладаць гісторыю, аддавала спаўна і набытыя выдатныя веды, і цяпло, і дабрыню сваёй душы, што вучні асабліва цанілі. Затым вучоба ў аспірантуры БДУ, абарона дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук, праца асістэнтам, старшым выкладчыкам на гісторыка-юрыдычным факультэце. Здавалася б, ёсць ужо добры навуковы багаж, толькі ўмела выкарыстоўвай яго пры рабоце са студэнтамі. Але калі Ірыне Ігараўне даручылі чытаць для будучых юрыстаў такія курсы лекцый, як "Асновы заканадаўства", "Грамадзянскае права", "Працоўнае права", прыйшла да думкі, што веды зноў неабходна папаўняць. Яна вырашае атрымаць другую вышэйшую адукацыю завочна ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. У час уступных экзаменаў пры спецыяльным тэсціраванні набрала адзін з самых высокіх рэйтынгаў.

І вось нядаўна Ірына Ігараўна Эсмантовіч атрымала дыплом (зноў з адзнакай!) аб заканчэнні Акадэміі па спецыяльнасці "Правазнаўства" (спецыялізацыя "Міжнароднае права"). Цяпер багаж неабходных ведаў у маладой выкладчыцы больш чым дастатковы. А значыць, будзе праца са студэнтамі, будучымі юрыстамі, зноў жа з уласцівай ёй адказнасцю, сур"ёзнасцю, належнай аддачай, адным словам -- на "выдатна".

Хутка першае вясновае свята -- 8 Сакавіка. Любіць яго І.Эсмантовіч за цёплыя сонечныя промні, пяшчотныя фарбы першацвета -- пралесак, блакіт неба, а яшчэ за тое, што разам з абуджэннем прыроды чакаеш і ў жыцці толькі лепшых перамен.

Няхай яно так і будзе.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

Аб зімовай сесіі мовай лічбаў

## ЗРУХІ Ў ЛЕПШЫ БОК ЁСЦЬ. І ГЭТА РАДУЕ

Лічаць: той яшчэ не сапраўдны студэнт, хто не зведаў, што такое сесія. Цяпер жа ўсе першакурснікі універсітэта, якія атрымалі сваё "баявое хрышчэнне" на нядаўніх экзаменах, завуцца імі па праву. Яны пераканаліся ў тым, што студэнцкае жыццё не такое ўжо і бесклапотнае. Аказваецца, здача залікаў і экзаменаў -- справа даволі складаная, патрабуе адказнасці, сканцэнтраванасці і напружанай працы. Даўно ўпэўніліся ў гэтым і старшакурснікі. А калі яны яшчэ і добра ўсведамляюць, што двойка ці пасрэдная адзнака могуць наогул пазбавіць стыпендыі ці значна знізіць яе памер, то прыкладаюць усе намаганні, каб у залікоўцы з"яўляліся толькі пяцёркі і чацвёркі. Іншая справа, як у каго гэта атрымліваецца.

Лічбы -- самы красамоўны сведка ўзроўню ведаў студэнта. У вучэбным аддзеле ГДУ, куды падаюцца зводкі з усіх факультэтаў, карэспандэнту нашай газеты паведамілі прыемную навіну: вынікі сёлетняй зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі аказаліся лепшымі, чым летась. Начальнік вучэбнага аддзела Н.І.Папкова дае ім каментарый:

-- Па-першае, узрос агульны працэнт паспяховасці. Ён склаў 81,2%. Нагадаю, что мінулай зімой ён быў такі -- 79%. Знізілася колькасць студэнтаў, якія не з"явіліся на экзамены з-за няздадзеных залікаў. Іх было толькі 3% у параўнанні з мінулагоднімі 7,3%. Павялічылася колькасць выдатнікаў -- 16,3% студэнтаў атрымалі толькі пяцёркі (летась 15,7%). Стала менш двоечнікаў: 13% супраць мінулагодніх 14,1%.

Па ўзроўню паспяховасці лідзіруе біялагічны факультэт. Тут самы высокі паказчык -- 90,7%. Рост прыкметны супраць мінулагодняга -- 83,2%. За імі ўпэўнена ідуць будучыя эканамісты -- 88,5 (82,1)%.

На трэцім месцы -- філфак: 87,5%, хаця гэта ніжэйшы паказчык у параўнанні з леташнім -- 95,3%. Геолага-геаграфічны факультэт таксама крышачку не дацягнуў, здаў пазіцыі -- 82,4% (летась 87,2). Гісторыка-юрыдычны факультэт, наадварот, значна палепшыў якасць ведаў -- 75,6% (66,4%). У фізікаў сітуацыя змянілася ў бок зніжэння ўзроўню ведаў, праўда, не вельмі значна -- 74,8% (79,9%).

Даўно не было такога прарыву ў бок паляпшэння паспяховасці на факультэце фізічнай культуры. Тут з 55,3% здолелі падняцца да 74,6%. Замыкае зводку матфак -- 68,8, хаця гэта лепшы паказчык супраць мінулагодняга -- 63,2%.

Радуе, што ў цэлым па універсітэту паспяховасць палепшылася. Але гэта не павінна заспакойваць ні кіраўніцтва факультэтаў, ні саміх студэнтаў. Дасягнутае, канешне ж, не мяжа, трэба яшчэ працаваць і працаваць.



Навукова-практычная канферэнцыя школьнікаў

# ПА ЭКАЛАГІЧНЫХ ПРАБЛЕМАХ СУЧАСНАСЦІ

Гомельскае абласное ўпраўленне і гарадскі аддзел адукацыі, наш універсітэт, яго геолага-геаграфічны факультэт і кафедра геаэкалогіі, гаррайінспекцыя па прыродных рэсурсах і акаляючаму асяроддзю, СШ N56 правялі на базе ГДУ І-ю гарадскую экалагічную навукова-практычную канферэнцыю вучняў сярэдніх школ г.Гомеля "Моладзь і экалагічныя праблемы сучаснасці".

У адной з аўдыторый геолага-геаграфічнага факультэта сабраліся юнакі і дзяўчаты, якіх пасапраўднаму хвалюе як сённяшні стан, так і будучыня не толькі роднага краю, але і ўсёй планеты.

Удзельнікаў канферэнцыі цёпла вітаў першы прарэктар універсітэта прафесар М.В.Селькін. Ён расказаў аб факультэтах і спецыяльнасцях вядучай вышэйшай навучальнай установы Беларускага Палесся, аб адкрыцці ў гэтым годзе новых спецыяльнасцей і спецыялізацый, выказаў упэўненасць, што пасля вучобы ў школах многія з удзельнікаў канферэнцыі стануць студэнтамі ГДУ.

Аб важнасці далучэння школьнікаў да мэтанакіраванай навукова-даследчай работы па найбольш вострых праблемах экалогіі гаварыў у сваім выступленні старшыня аргкамітэта канферэнцыі дэкан геолага-геаграфічнага факультэта універсітэта, прафесар А.П.Пінчук. Ён расказаў таксама пра ўзначальваемы ім факультэт, яго спецыяльнасці і спецыялізацыі, заклікаў здольную моладзь паступаць у ГДУ.

Ад Гомельскага абласнога аддзялення Беларускага Фонду Сораса выступіў яго старшыня Ю.І.Варонежцаў. Ён запэўніў, што найбольш важныя экалагічныя праекты школьнікаў знойдуць падтрымку і будуць матэрыяльна заахвочвацца аддзяленнем Фонду.

Перад удзельнікамі канферэнцыі выступілі таксама прарэктар па навуковай рабоце ГДУ прафесар Д.Р.Лін і дырэктар СШ N56 А.А.Вішнеўскі.

На канферэнцыі працавала тры секцыі: "Агульныя пытанні экалогіі і аховы прыроды", "Радыеэкалогія і экалогія чалавека", "Біяэкалогія". Іх работай кіравалі выкладчыкі універсітэта кандыдаты навук В.А. Хількевіч, А.І.Паўлоўскі, А.М.Кусянкоў. Было заслухана і абмеркавана 30 навуковых дакладаў. Амаль трэць з іх была падрыхтавана вучнямі СШ N56. І гэта заканамерна, бо названая школа з"яўляецца базавай універсітэта. Не выпадкова яе юныя даследчыкі выйшлі пераможцамі ў кожнай з трох секцый. Найбольш актуальнымі і грунтоўнымі прызнаны даклады Алены Мядзведзевай "Чалавек і акаляючае асяроддзе: вынікі сацыялагічнага апытання моладзі г.Гомеля", Таццяны Лузан -- "Афарбоўка яйца як адзін са спосабаў ацэнкі эмбрыянальнага развіцця птушанят", Юліі Вішнеўскай -- "Ачыстка малака ад радыенуклідаў".

Другія месцы прысуджаны навуковым дакладам Антона Стражынскага (СШ N56), Вячаслава Гізенкі (СШ N19), Ігара Новікава (СШ N51), трэція -- Аляксандра Нікалаева (СШ N66), Дзяніса Атаманчука (СШ N56), Наталлі Пятровай (СШ N41).

Усе пералічаныя школьнікі адзначаны дыпломамі і ўдастоены прызоў Гомельскай гаррайінспекцыі па прыродных рэсурсах і акаляючаму асяроддзю.



**На здымку:** з навуковым дакладам выступае Таццяна Лузан.

Фота **У.ЧЫСЦІКА.**

## ДА ЮБІЛЕЮ НАШАЙ ВНУ

У 2000-м годзе Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны будзе адзначаць юбілей сваёй вучэбна-матэрыяльнай базы -- 70 годдзе з дня ўтварэння Гомельскага педагагічнага інстытута імя В.П.Чкалава. Да гэтага часу ў музеі-лабараторыі Ф.Скарыны будзе разгорнута новая экспазіцыя "Гісторыя Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны".

У сувязі з гэтым рэктарат нашага універсітэта звяртаецца да ўсіх студэнтаў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў і пенсіянераў ГДУ імя Ф.Скарыны з вялікай просьбай: перадавайце, калі ласка, у музей-лабараторыю ўсе матэрыялы, якія адносяцца да названых ВНУ, расказваюць аб іх дзейнасці (старыя фотаздымкі, магнітафонныя запісы, рэчы, навуковыя і іншыя творчыя працы як вашы асабістыя, так і тых, хто вучыўся або працаваў тут, разнастайныя дзяржаўныя і мясцовыя ўзнагароды і падарункі за ўзорную вучобу і працу ў сценах гэтых ВНУ, асабістыя рэчы знакамітых студэнтаў і выкладчыкаў), прыходзьце для запісу на магнітафон ці відэакасету ўспамінаў, расказаў пра лепшых людзей, найбольш значныя і запамінальныя падзеі ці прыносьце запісы на паперы.

Усё гэта будзе прадметам цікавасці многіх і многіх наведвальнікаў, захаваецца на дзесяцігоддзі і стагоддзі, а не будзе пыліцца ў вашых скрынках, на кніжных паліцах ці знікаць з вашай памяці.

# АЛІМПІЯДЫ ВЫЯЎЛЯЮЦЬ ТАЛЕНТЫ



(Заканчэнне. Пачатак у №2)

Такая вялікая праца, як падрыхтоўка і правядзенне алімпіяд па праграміраванню, пераарыентацыя вучэбнага працэсу, не можа адбывацца без удзелу значнай колькасці людзей -- выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў ГДУ, настаўнікаў і вучняў школ. На жаль, іх самаадданая праца вельмі часта ніяк не заахвочваецца матэрыяльна. Таму хочацца выказаць вялікую ўдзячнасць усім, хто аказваў і надалей будзе аказваць значную дапамогу як у арганізацыі і правядзенні алімпіяд, так і ў непасрэднай актыўнай рабоце са школьнікамі і студэнтамі. Перш за ўсё -- дэкану матэматычнага факультэта У.В.Арлову, загадчыкам кафедр МПК І.В.Максімею і ВМ і праграміравання М.І.Жадану, выкладчыкам І.М.Зісельману, В.Д.Ляўчуку, У.А.Караткевічу, А.Ф.Каморнікаву, Л.А.Цурганавай, Т.Р.Багданавай, Т.М.Дзёмавай, настаўнікам інфарматыкі А.Л.Міняйлавай (абласны ліцэй), Г.А.Савідавай і І.Н.Ульянавай (гарадскі ліцэй), А.М.Філінскаму (СШ N27), студэнтам матфака К.Вулаху, А.Галаціну і В.Краўцову, а таксама супрацоўнікам навукова-даследчай лабараторыі, якую ўзначальвае прафесар В.В.Мажароўскі.

Зразумела, што для таго, каб і далей паспяхова выконваць свае функцыі па адбору найбольш таленавітых школьнікаў і іх эфектыўнаму навучанню, нельга спыняцца на дасягнутым. Аб гэтым, у прыватнасці, гаварылася на адным з апошніх пасяджэнняў Савета матэматычнага факультэта. На ім абмеркаваны каляндар алімпіяд на навучальны год. Вырашана праводзіць адборачную алімпіяду для ўдзелу ў рэспубліканскай і міжнароднай алімпіядах па праграміраванню ў верасні, у кастрычніку плануецца ўдзел у рэспубліканскай алімпіядзе, у снежні -- у рэгіянальным туры міжнароднай алімпіяды, а ў сакавіку -- у яе фінальным турніры. Для гэтага неабходна трапіць у пару пераможцаў рэгіянальнага тура, і такая задача перад нашымі камандамі ставіцца.

Плануецца круглагадовая падрыхтоўка каманд да студэнцкага каманднага першынства свету, і да гэтага працэсу запрашаюцца ўсе жадаючыя. Ужо зараз вядома: з пачаткам бягучага вучэбнага семестра да рэгулярных трэніровак прыступяць 3 каманды матфака, 1 -- фізічнага факультэта, каманды БелДУТа і ГПІ. Распрацаваны план падрыхтоўкі, куды ўваходзяць такія мерапрыемствы:

-- скласці "джэнтльменскі набор" ведаў, уменняў і навыкаў, якімі павінен валодаць кожны член каманды і каманда ў цэлым;

-- падрыхтаваць метадычны дапаможнік, які б у канцэнтраванай форме ўтрымліваў на магнітным носьбіце ўсю неабходную інфармацыю;

-- для кожнай каманды, з улікам індывідуальных асаблівасцей яе членаў, скласці "хартыю", па якой каманда павінна весці гульню;

-- кожны тыдзень праводзіць трэніровачныя спаборніцтвы, калі адна з каманд рыхтуе рашэнні задач і тэсты загадзя і ажыццяўляе ў час гульні ўсю дзейнасць журы, а астатнія каманды спаборнічаюць "у баявой абстаноўцы". Ролю журы каманды выконваюць па чарзе;

-- рэгулярна праводзіць трэніровачныя заняткі, калі кадзіраванне задач не праводзіцца, а замест гэтага, пасля распрацоўкі камандамі алгарытмаў, праводзіцца іх сумесны разбор і параўнальны аналіз;

-- рэгулярна праводзіць аналіз працэсу рашэння задач кожнай камандай з мэтай пошуку слабых месцаў і карэкціроўкі "хартыі" каманды.

У план мерапрыемстваў матфака ўключана таксама правядзенне "Тыдня студэнцкай і школьнай навукі" з удзелам аспірантаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ і іншых ВНУ (арыентыровачна з 17 па 22 сакавіка). Сюды ўвойдуць гарадская алімпіяда па праграміраванню; выстаўка-конкурс педагагічных, вытворчых і іграву праграмных сродкаў; міжвузаўская навукова-тэхнічная канферэнцыя; конкурс на лепшы навуковы даклад па інфармацыйных тэхналогіях і камп"ютэрных навуках; конкурс лепшых публікацый за бягучы навучальны год (студэнтаў і супрацоўнікаў ГДУ); кірмаш рабочых месцаў у сферы новых інфармацыйных тэхналогій; прэзентацыі гомельскіх фірм, якія працуюць у сферы інфармацыйных тэхналогій; выстаўка-продаж камп"ютэрнай літаратуры вядучымі гандлюючымі арганізацыямі горада і рэспублікі; правядзенне "Дня адкрытых дзвярэй матэматычнага факультэта".

Усе, хто жадае прымаць удзел у падрыхтоўцы або правядзенні любога з названых мерапрыемстваў, а таксама гатовы ўнесці свае прапановы, могуць звяртацца ў дэканат матэматычнага факультэта.

Аднак, акрамя запланаваных мерапрыемстваў, якія ў той ці іншай ступені могуць быць выкананы на ўзроўні факультэта, ёсць пытанні, якія на гэтым жа ўзроўні невырашальныя, але станоўчае вырашэнне якіх у значнай ступені магло б павысіць якасць і выніковасць вучэбна-выхаваўчай работы па матфаку. Размова ідзе аб вяртанні сюды спецыяльнасці 2204 -- "Праграмнае забеспячэнне вылічальнай тэхнікі і аўтаматызаваных сістэм (або аналагічнай у новай рэспубліканскай класіфікацыі спецыяльнасці).

Якія ёсць аргументы "за"? Па-першае, дзесяцігадовы вопыт выкладання дысцыплін уласна гэтай спецыяльнасці і адпаведная напрацоўка рабочых праграм, метадычнага забеспячэння і спецыяльных праграмных комплексаў, істотна павышаючых якасць і эфектыўнасць навучальнага працэсу.

Другі аргумент -- статыстыка працаўладкавання выпускнікоў гэтай спецыяльнасці: практычна ўсе, хто ў нас вучыўся, а не імкнуўся толькі дыплом атрымаць, знайшлі сабе работу па спецыяльнасці і лічацца высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Нашы лепшыя студэнты могуць нават "торговаться" з работадаўцамі.

Па-трэцяе, шматгадовы вопыт прафесійнай практычнай і навукова-даследчай работы ў адпаведных напрамках, якія праводзяцца спецыялістамі матэматычнага факультэта, і перш за ўсё, кафедрамі МПК і вылічальнай матэматыкі і праграміравання, што было бліскуча пацверджана паспяховай работай Савета па абароне дысертацый пад кіраўніцтвам д.т.н., прафесара І.В.Максімея, на якім адразу 6 спецыялістаў матфака абаранілі дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук.

Яшчэ адзін аргумент. Відавочна, што ўсё больш узрастае патрэба грамадства, адукацыі, вытворчасці і камерцыйнай сферы ў высокакваліфікаваных спецыялістах у галіне камп"ютэрных навук, апошнім прыкладам чаго, у прыватнасці, стаў зварот у дэканат матфака кіраўнікоў ТАА "Эгал-інвест" з мэтай пошуку спецыялістаў для распрацоўкі праграмнага забеспячэння.

І апошняе. Ёсць неабходнасць стратэгічнай арыентацыі Беларусі на развіццё новых інфармацыйных тэхналогій і выхад менавіта з імі і адпаведнымі спецыялістамі на міжнародны рынак, як рэспублікі з высокаразвітым навукова-тэхнічным патэнцыялам і не маючай уласнай сыравіннай і энергетычнай базы.

**М.ДАЛІНСКІ,**
**ст. выкладчык кафедры матэматычных праблем кіравання.**



# ДУШЫ ЎЗВЫШАЕ ВОБРАЗ ЖАНОЧЫ

Што дапамагае нам выжыць, зберагчы чалавечнасць у той нялёгкі час, калі чалавек нічога, ці амаль нічога, не можа зрабіць супраць абставін, супраць дужэйшага за сябе?

У шматмернай жыццёвай плыні знойдзецца шмат адказаў на гэтае пытанне. Але толькі адзін з іх мае абсалютную існасць: "Нават у самы цяжкі час нас выратоўвае духоўнасць". Яна перадаецца як самае каштоўнае з пакалення ў пакаленне. Магчыма, гэта сапраўды боскі дар, якім надзелены той, хто чалавекам завецца. Пісаў жа некалі вялікі філосаф Імануіл Кант: "Дзве рэчы напаўняюць душу заўсёды новым і ўсё большым здзіўленнем і глыбокай павагай, чым часцей і даўжэй мы думаем над імі, -- гэта зорнае неба нада мной і маральны закон у ва мне".

Хочацца верыць у сакральнасць, непазбыўнасць духоўных, маральных пачаткаў у чалавеку. Таму прагна шукаеш выразнае іх праяўленне ў навакольным жыцці. Збіраеш і захоўваеш у памяці тыя хвалюючыя моманты, дзе духоўнае прадстае ўвачавідкі і ва ўсёй сваёй велічы.

Такім рэальным увасабленнем маральнай прыгажосці, творчага натхнення і сур"ёзнай працы над сабой уявіліся мне дзяўчаты-студэнткі, што ўдзельнічалі ў паэтычнай вечарыне, прысвечанай жаноцкай лірыцы.

Кожны год студэнты 4 курса філалагічнага факультэта рыхтуюць "выпускную" працу, якой заканчваюць вывучэнне курса методыкі літаратуры і з якой могуць ісці ў школу на педагагічную практыку. З мінулых гадоў запомніліся літаратурна-музычныя кампазіцыі па творчасці Марыны Цвятаевай, Аляксандра Блока, паэтаў-сімвалістаў, Барыса Пастэрнака, Мікалая Рубцова. "Выпускная" работа выконваецца самастойна. У ёй галоўнае ўсё -- і сцэнарый, і прафесійна-маральныя якасці будучых настаўнікаў.

На гэты раз вечар рыхтаваўся студэнтамі, якія набываюць прафесію выкладчыкаў рускай і беларускай моў і літаратур. Напэўна, за іх адказнасць можна было не хвалявацца. Ужо тры гады працую з гэтымі студэнтамі і заўсёды яны радуюць мяне, як і іншых выкладчыкаў, сваімі ведамі, жаданнем атрымаць добрую адукацыю. Менавіта студэнты гэтага курса -- Аляксандр Якушэнка, Юрась Ільін, Дзяніс Пракоф"еў -- рызыкнулі ўжо зараз правесці шэраг урокаў па сусветна вядомаму раману Міхаіла Булгакава "Майстар і Маргарыта".

Дзяўчаты працавалі над паэтычнай вечарынай. Добрым арганізатарам і сааўтарам кампазіцыі выказала сябе Ірына Трохава. Ёй дапамагала Таццяна Сусоева.



Як заўсёды, ініцыятыўна праявілі сябе Вольга Іткіна, Ала Партнова, Ліля Хімянкова. Пра гэтых дзяўчат трэба сказаць асобна. Ніколі не бачыла на іх тварах абыякавасці, ці то недобразычлівасці. Наадварот -- удумлівы позірк, неардынарны вобраз мыслення -- і ўсё гэта так хораша стасуецца з жаноцкай прывабнасцю.

Гучалі вершы Сапфо, Княжніной, Ахматавай, Янішчыц. Дзяўчаты чыталі вершы пра вечнае жаданне кахання, жаночае прызначэнне быць "мироткущей", "хранительницей духовных богатств". Чыталі вельмі добра, як літаратары, якія адчуваюць асалоду слова, умеюць перадаць музычную сугучнасць верша, нават семантыку гуку.

Самі, і ў знешнім обліку, і ў адчуванні прыгажосці, былі падобны на тых лірычных гераінь, пра пачуцці якіх спавядаў мастацкі вобраз. Разумееш, ніколі штучна не прыдбаеш такой гармоніі вобліку, думкі, пачуццяў, калі няма ў душы і на сэрцы высокіх імкненняў, дзейснай энергіі, трапяткога жадання тварыць хараство.

Яшчэ больш яскрава адчулася сапраўдная сувязь часоў, бязмежная ўлада жаночага пачатку, калі свае творы прачытала студэнтка-паэтка Надзея Новік. Яна піша вершы, у якіх чуюцца тая ж спрадвечная складанасць жаночых пачуццяў, высокая ўзнёсласць імкненняў. У шчырасць, жывую рэальнасць яе паэтычных радкоў нельга не паверыць, яна сапраўды так адчувае, гэтак жыве.

Магчыма, усё на паэтычнай вечарыне ўявілася мне ў ідэальным святле, занадта замілаваным. Але ж без ідэальнага, прыгожага, пагадзіцеся, нельга жыць. Усё нашае жыццё, няўмоўльна бягучы час пацвярджае гэта, як і думку Дастаеўскага, які пісаў, што без узвышаных намаганняў "ніколі не атрымаецца добрай рэчаіснасці... нічога не будзе, акрамя яшчэ большай брыдоты".

**Н.КАПШАЙ,**
**асістэнт кафедры рускай літаратуры.**

**На здымку: удзельніцы вечарыны.**

**Фота У.Чысціка.**

***Сегодня впервые на страницах нашей газеты представлено детское творчество, а вернее, школьное. Оказывается, дети некоторых наших преподавателей и сотрудников пробуют свои силы в поэзии и прозе. И пусть не все еще получается на должном уровне, но искренность, наблюдательность, индивидуальность, которые присущи первой пробе пера, все же привлекают.***

# ВСТРЕЧА

Солнце... Какое яркое, теплое солнце!.. Приятно выйти на улицу и, зажмурившись, подставить лицо под его теплые лучики. Когда оно светит, на душе становится светло, тепло и спокойно. И тогда знаешь, что не все так плохо, как может показаться с первого взгляда. Как хорошо, что все могут видеть солнце каждый день!!!

... Отход пригородного поезда задерживался вот уже на 20 минут. Но пассажиры, давно привыкшие к этому, спокойно ждут. Что могут значить для этих старых ворчливых бабок 20 минут, если они пришли в вагон, чтобы занять удобные места за 1,5 часа до отхода поезда?..

Вот одна из представительниц вышеназванного типа людей. Она уныло смотрит в окошко на электронное табло, на котором еле-еле можно разобрать буквы: 24.07.96. О чем она думает? Может, о прожитых годах? Нет! Скорее о совершенно другом.

А вот иной пассажир -- молодой парень в темных очках. Странно, как он сюда попал? Ведь в таких поездах едут в основном дачники. Не думаю, что такой парень может копаться на огороде. Это выше его достоинства. Он стоит. Но вовсе не из-за того, что уступил свое место бабульке. Ему просто лень сгонять со своих мест ворчливых пенсионерок. Ведь те стали бы активно обороняться, развели бы базар с матом и рукоприкладством. Поэтому парень просто стоит и щелкает семечки, выплевывая скорлупу на пол.

Еще компания, состоящая из пьяных мужиков. Они сидят, играют в карты, пьют пиво, выбрасывая пустые бутылки за окошко, прямо на рельсы.

Наконец, поезд тронулся. Пыльные, грязные вагончики медленно потянулись из города. В тамбуре одного из них стоят несколько человек. Среди них молодой парень лет 20-ти, полудремлющий старик с сеточкой, баба с подозревающим всех взглядом, еще несколько человек. Тамбур, как и весь поезд, имеет печальный вид: кучи мусора на полу, расписанные непристойными словами стены, полузакрытые двери, оплеванные поручни.

Постепенно поезд выбрался из города, медленно потянулись пригородные районы, остановки. Первая из них. Двери с шумом открылись. На платформе стоят две девушки. Они быстро подбежали к вагону и вскарабкались на крутые ступеньки. Двери закрылись. Девушки не стали проходить в вагон, остались в тамбуре. Вероятно, им недалеко ехать. Первая девушка держала в руке сумку, осторожно прислонившись к стенке. Ее темные волосы аккуратно стянуты в тугой хвостик, у нее уставший взгляд и мешки под глазами.

А вот вторая выглядела несколько иначе. Летняя майка и легкие брюки свободно облегали ее красивую фигуру. В руках была маленькая дамская сумочка. Длинные белые волосы разбросаны на плечах, переливаясь в солнечных лучах. На глазах -- темные очки, но даже они не могли скрыть от проницательных взглядов пассажиров необыкновенную красоту девушки.

Увидев симпатичную попутчицу, парень, стоящий рядом, оживился. Он быстро стянул с ушей наушники, выключил плэйер и окинул ее оценивающим взглядом. Затем улыбнулся и начал переходить в атаку:

-- Как вас зовут?

-- Лиза, -- тихо сказала она, чуть улыбнувшись. Она немного смутилась, было видно, что не привыкла к тому, что можно так бесцеремонно кадрить девушку.

-- А меня Сергей. Знаете, как только вы вошли, сразу понравились мне.

Лиза молчала. Она не знала, что сказать парню.

-- Может перейдем на "ты"?

-- Пожалуй, -- неуверенно ответила девушка.

Поезд притормозил и остановился. Двери открылись. Зашло несколько человек. Некоторые остались в тамбуре, остальные прошли в вагон. Парень подождал, пока двери закроются, и продолжил разговор.

-- Ты живешь в городе или в деревне?

-- В городе.

-- Отлично, тогда мы сможем встретиться.

-- ...

-- Завтра ты будешь в городе?

-- ... Да.

-- Завтра встретимся?

До сих пор молчавшая подруга Лизы, неодобрительно посмотрев на парня, тихо проворила:

-- Лиза...

Парень понял, что подруга может помешать их встрече.

-- А ты, что ее мать, что ли? Не решай за нее! -- грубо оборвал он ее.

Девушка замолчала. Лиза не сдвинулась с места.

-- Так мы встретимся?

Лиза не успела ничего сказать, так как поезд притормозил у станции и двери открылись. На платформе показалась толстая баба с большими сумками в обеих руках. С такой поклажей ей было трудно взобраться в вагон.

-- Помоги, сынок, возьми сумки! -- попросила она Сергея.

Но тот даже не шелохнулся, сделав вид, что это не к нему обращаются. Бабка кое-как забралась сама и, ничего не сказав, прошла в вагон.

Двери закрылись. Поезд тронулся.

-- Ну, так встретимся?

-- Не знаю, -- неуверенно ответила та.

За окном потемнело, начался дождь, в тамбуре зажегся свет. Все молчали. Воцарилась тишина, которую нарушал только стук колес.

За окнами поезда постепенно стано-



вилось все темнее и темнее. Парень снял очки и стал разглядывать девушку: "Она ничего, симпатичная. Интересно, какого цвета у нее глаза?"

Вдруг свет погас, в тамбуре стало темно. Пассажиры зашумели, закопошились. Кое-кто стал искать свой кошелек. Лиза спросила у своей подруги:

-- Что происходит?

-- Свет погас.

Лиза успокоилась и сняла темные очки.

Свет зажегся вновь. Пассажиры снова смогли видеть друг друга и обрели покой. Только тут они заметили, что красивая девушка сняла темные очки, открыв свои прекрасные зеленые глаза с невидящим взглядом.

Двери со скрипом открылись. Это была остановка при въезде в другой город, поэтому выходило очень много людей. Двери закрылись. Лиза почувствовала, что рядом никого нет.

-- Он еще тут? -- спросила она у своей подруги.

Сергей стоял рядом. Он просто внимательно рассматривал невидящий взгляд Лизы.

-- Да, -- ответила подруга.

Оставшиеся в тамбуре пассажиры внимательно разглядывали слепую девушку. Услышав ответ подруги, Лиза вновь быстро надела темные очки. Ей не хотелось, чтобы юноша видел ее такой беспомощной.

Прибыл поезд на вокзал уже почти вечером. Двери в последний раз открылись, последние пассажиры вышли из вагона. Но Лиза с подругой стояли на том же месте. Подруга потянула Лизу за рукав к выходу. Та не двигалась с места.

-- Сергей, -- позвала она.

Но Сергей ее уже не слышал. Он раньше вышел из поезда и уже пил пиво со своими друзьями, встретившими его на вокзале.

**Наташа ПИНЧУК,**
**ученица 9 класса СШ № 16.**



## Улыбнитесь!

*Чтобы производить неизгладимое впечатление, женщины заглаживают морщины.*

* * *

*Иные женщины говорят до тех пор, пока их не остановят.*

* * *

*Женщины живут припеваючи, когда мужья пляшут под их дудку.*

* * *

*Случается, что пустые женщины заполняют до предела жизнь содержательных мужчин.*

* * *

*Если у жены бездна вкуса, муж живет как над пропастью.*

* * *

*Женщины сообща открыли новый физический закон, согласно которому их слабости превращаются в силу.*

* * *

*Стала заниматься гимнастикой йогов -- поза змеи ей удается больше всего.*

* * *

*Считала себя вечно молодой, потому что у нее была девичья память.*




## ДИАЛОГИ

*-- Доктор, посмотрите, пожалуйста, мою жену. Почему она все время кричит?*

*-- Вполне естественно, -- заметил врач, -- горло у нее здоровое.*

* * *

*-- Собирайся, уже конец рабочего дня.*

*-- А чего собираться, закрою рот и пойду домой.*

* * *

*-- Ты не должна была рассказывать никому.*

*-- Но ты сама говорила: "Тайна для всех". Я всем и рассказала.*

* * *

*Покупатель -- продавщице:*

*-- Постоянно вы всех обвешиваете. Вы старая аферистка.*

*-- Почему старая? -- удивилась продавщица. -- Мне всего двадцать лет.*

# О, ЭТИ ЖЕНЩИНЫ!..

## ВОПРОСЫ РЕБРОМ

*Можно ли стать гурманом, поедая глазами женщин?*

* * *

*Украшает ли женщину скромная зарплата?*

## ОБЪЯВЛЕНИЯ

*Меняю ахиллесову пяту на греческий профиль.*

* * *

*Согласна убирать там, где сорят деньгами.*

* * *

*Меняю бархатное платье на путевку в бархатный сезон.*

* * *

*Строю воздушные замки из материала заказчика.*

* * *

*Меняю духовную пищу на материальные блага.*

## МИНИАТЮРЫ

*-- Что с вашим телевизором? -- спросил телемастер хозяйку.*

*-- Звук есть, а соображения нет, -- ответила та.*

* * *

*-- Ты мне что-нибудь сыграешь, дорогая?*

*-- С удовольствием, если ты будешь плясать под мою дудку.*

* * *

*-- Ну, уступи мне, -- просит жена мужа, -- я слышала, что уступает тот, кто умнее.*

* * *

*-- У этой женщины семь пядей во лбу, -- сказали ей.*

*-- Бедняжка! Представляю, какую ей нужно носить прическу, чтобы прикрыть такой лоб, -- посочувствовала та.*

* * *

*-- Эта новая покупка еще раз говорит о том, что у тебя нет никакой скромности, -- сказал муж жене.*

*-- Да, это так, но поскольку скромность украшает человека, а ее у меня нет, нужны мне хоть какие-нибудь другие украшения, -- сказала жена.*

* * *

*-- Моя жена такая внимательная! Когда у меня болели глаза и она услышала от врача, что зеленый цвет полезен для глаз, она сразу же купила себе новый зеленый костюм.*

* * *

*Вечером муж говорит своей жене:*

*-- Дорогая, хочешь я достану тебе звезду с неба!*

*-- Никаких звезд, сегодня ты сидишь дома!*

* * *

*Женщина приходит в полицию:*

*-- У меня похитили жемчужное ожерелье.*

*-- Как оно выглядело?*

*-- Как настоящее...*

* * *

*-- Смотри-ка, Ваня, мое платье и твоя рубашка из одного материала! -- заметила жена.*

*-- Ну, вот, Таня, а ты говорила, у нас нет ничего общего! -- обрадовался муж.*



**-- Смотрите, милочка, какие странные шляпы носили наши бабушки!**

* * *

*Женщины так разговорились, что общий язык потеряли.*

* * *

*-- Что может быть сильнее красоты?*

*-- Косметика.*

* * *

*Недавно в г. Н. открылась выставка "Моды сезона-97". Ее первые посетительницы отделались легким испугом.*

* * *

*Женская логика: "Между нами все кончено, хотя ничего и не было".*

* * *

*Чем больше заботишься о своей внешности, тем обманчивее она.*

* * *

*Некрасивых женщин не бывает, есть женщины, которые еще не в форме.*

## АНЕКДОТЫ

*-- Мужу не понравился мой новый шарфик.*

*-- Так обменяй его.*

*-- Отличная мысль! А где меняют мужей?*

* * *

*Женщина показывает часовому мастеру стрелку от будильника.*

*-- А где же часы? -- спрашивает мастер.*

*-- Зачем часы? Часы в порядке. Только стрелки почему-то не движутся.*

* * *

*-- Ну, что, соседка, муж вас больше не бьет? Ведь в последний раз суд оштрафовал его за это на пять крон.*

*-- Нет, с тех пор пальцем не трогает. Но теперь у него появилась странная привычка. Каждый вечер, придя домой, он пристально смотрит на меня, а затем кладет в копилку пять крон.*

* * *

*-- Моя жена очень любит бриллианты.*

*-- Но ведь на это уходит уйма денег?*

*-- Не денег, а времени.*

*-- В каком смысле?*

*-- Она не может спокойно пройти мимо ювелирного магазина и часами простаивает у витрины.*

# СКАЖАМ ЗІМЕ: "БЫВАЙ!"



Для тых, хто зіму не любіць за яе халады і завеі, яна і цягнецца дольш, чым астатнія поры года. Для аматараў жа лыжных прагулак, лядовых баталій яна пралятае хутка, не паспееш і заўважыць. Хіба толькі зусім нечаканая адліга, плюсавая тэмпература ў самым халодным месяцы -- лютым можа прынесці раздражнёнасць за такія "капрызы" матухны-зімы.

Але якой бы зіма ні была, па закону прыроды павінна ўступіць месца вясне. Здаўна існуе традыцыя праводзіць зіму весела, з гульнямі, карагодамі, атракцыёнамі і г.д. Носіць яна назву -- Масленіца.

Штогод наладжваецца свята провадаў зімы і ў нашым універсітэце. 2-га сакавіка культурны цэнтр ГДУ запрашае на яго студэнтаў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў. У праграме -- цікавыя мерапрыемствы, у якіх можа прыняць удзел кожны жадаючы: розыгрышы прызоў, сярод якіх будуць вельмі смачныя і нечаканыя, частаванне гарачымі блінамі з чаем, продаж сувеніраў і кандытарскіх вырабаў, выступленні творчых калектываў універсітэта. Спальванне саламянага чучала Зімы стане кульмінацыйным момантам свята.

Адкладзіце свае хатнія клопаты і прыходзьце на Масленіцу. Добры настрой вам гарантуецца.

Свята адбудзецца каля першага вучэбнага корпуса. Пачатак -- у 11 гадзін.

Інфармуе служба "01"

## НАЙВЯЛІКШАЯ СТРАТА -- ГІБЕЛЬ ЛЮДЗЕЙ

За мінулы год у Гомельскай вобласці адбылося звыш 3 тысяч пажараў, страты ад якіх ацэньваюцца амаль у 42 млрд. руб. Горш таго, 150 чалавек, сярод якіх 14 дзяцей, загінулі ў агні, а 122 -- атрымалі апёкі рознай цяжкасці і траўмы.

І вось высакосны год мінуў. Здавалася б, можна было ўздыхнуць з палёгкай нам, пажарнікам. Аднак за прайшоўшы месяц бягучага года на тэрыторыі Цэнтральнага раёна г.Гомеля ўжо адбыліся 4 пажары. Толькі мінула навагодняя ноч, а праз дзень пажарныя аўтамашыны спяшаліся на дапамогу жыхарам жылога дома N5 па вул. Білецкага. У памяшканні кафэ "Дружба", якое знаходзіцца на яго першым паверсе, бушавала полымя. Прычынай пажару стаў адагрэў труб ацяплення адкрытым агнём (паяльнай лямпай). Толькі дзякуючы хуткім і ўмелым дзеяннем работнікаў пажарнай аховы, агонь не ахапіў увесь дом, які да таго ж з"яўляецца помнікам архітэктуры.

Неасцярожнасць пры курэнні паслужыла прычынай двух пажараў у жылых дамах па вул. Катуніна і пр.Леніна, дзе гаспадар адной з кватэр задыхнуўся ў дыме.

Як ні сумна, а пачатак года зноў азнаменаваўся новай трагедыяй.

Пажарная ахова папярэджвае жыхароў г.Гомеля: "Будзьце асцярожнымі ў абыходжанні з адкрытым агнём і не забывайце, што непатушаны акурак можа стаць прычынай вялікай бяды".

**Л.КОШАЛЬ,**
**дзяржаўны інспектар Цэнтральнага раёна па пажарнаму нагляду.**

*Звярніце ўвагу!*

# ДЛЯ ВАШАГА ЗДАРОЎЯ

Як вядома, у рэспубліцы ўзнікла складаная сітуацыя з захворваннем людзей на дыфтэрыю. Каб пазбегнуць эпідэміі, медыкамі было прынята рашэнне аб абавязковай вакцынацыі насельніцтва для выпрацоўкі актыўнага імунітэту супраць гэтай хваробы.

Вакцынацыя праводзілася работнікамі універсітэцкага медпункта і сярод выкладчыкаў, супрацоўнікаў ГДУ. Усім тым, каму ўжо былі зроблены 2 прышчэпкі супраць дыфтэрыі, неабходна яшчэ адна -- трэцяя на ліку, каб арганізм выпрацаваў стойкі імунітэт. Інакш належнага эфекту не будзе дасягнута.

Вас чакаюць у медпункце ГДУ для прышчэпак штодзённа, акрамя выхадных, з 10 да 16 гадзін. Не адцягвайце візіт да нас, вакцынацыя павінна быць завершана да канца сакавіка.

**В.КАНАПЛІЦКАЯ,**
**заг. медпункта ГДУ.**



*ПОДЫХ ВЯСНЫ*

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб"яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- гісторыі ўсходнеславянскіх народаў -- загадчыка кафедры;

-- правазнаўства -- асістэнта;

-- філасофіі -- дацэнта.

Тэрмін падачы заяў не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты выказваюць глыбокае спачуванне начальніку вучэбнага аддзела **ПАПКОВАЙ** Ніне Іванаўне з выпадку напаткаўшага яе гора -- смерці **МАЦІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, адрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 62
Падпісана да друку 25.02.97.